УДК 39

# ЭКАНАМІЧНЫ І СОЦЫЯКУЛЬТУРНЫ АСПЕКТ САМАГОНАВАРЭННЯ Ў СЕЛЬСКІМ ЛАНДШАФЦЕ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х – 1960-х гг.

***канд. гіст. навук, дац. А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Самагонаварэнне ў вясковым соцыуме прадстаўляла сабой складаны сацыяльна-эканамічны феномен, які апрача сваёй утылітарнай прагматыкі меў некалькі важных дадатковых праекцый – соцыякультурную, абрадавую і камунікацыйную. Самагонаварэнне, як форму нелегальнай эканамічнай дзейнасці, можна разглядаць як адмысловую праяву «ценявой» гаспадарчай актыўнасці беларускіх сялян у складаных умовах калгаснага ладу другой паловы 40-х – 60-х гг XX ст.*

***Ключавыя словы:*** *самагонаварэнне, самагон, сістэма жыццязабеспячэння, вёска, нелегальны гандаль, тавараабменныя аперацыі, Паўночная Беларусь.*

**Уводзіны.** Слова "самагон" (або "самагонка") у сучасным значэнні – самавольна, нелегальна выраблены моцны алкагольны напой шляхам перагнання праз самаробныя апараты алкагольнай масы, атрыманай у выніку браджэння збожжавых прадуктаў, цукру, бульбы, буракоў ды іншых прадуктаў, якія змяшчаюць крухмальныя рэчывы – з'явілася толькі падчас Першай сусветнай вайны ў выніку ўвядзення "сухога закону" [1, с. 103]. Гісторыя самагону цесна звязана з войнамі, рэвалюцыямі, эканамічнымі крызісамі, калі хатняя вытворчасць спіртных напояў станавілася тактыкай адаптыўнага рэагавання на неспрыяльныя ўмовы жыцця. У гэты час самагон станавіўся своеасаблівай хадавой валютай для так званай "другой" эканомікі, бо адыграваў ключавую ролю пры тавараабменных аперацыях як у вясковым соцыўме, так і паміж вёскай і горадам, быў сродкам разліку за дробныя побытавыя паслугі, а таксама служыў крыніцай для заробку грошай, якія потым ішлі на выплату падаткаў ці набыццё неабходных тавараў. Паступова самагон трывала ўвайшоў у жыццё вёскі і пачаў выконваць не толькі ўтылітарную, але і сацыяльна-культурную і нават рытуальную ролю.

Што датычыць тэрміна "самагонаварэнне", то ў нарматыўных актах ён ужываецца як зборнае паняцце, якое азначае не толькі выраб самагонкі, але і вытворчасць у хатніх умовах іншых моцных спіртных напояў, вырабу апаратаў, прызначаных для гэтай мэты, захоўванне і збыт гэтых напояў і апаратаў [2, с. 8]. У разглядаемы перыяд вылучаюць тры эканамічныя тыпы самагонаварэння, якія адрозніваліся мэтамі яго вытворчасці: спажывецкі (вытворчасць для асабістых патрэб), спажывецка-таварны (вытворчасць адначасова і для асабістых патрэб, і на продаж), таварны тып (вытворчасць толькі на продаж). Аднак палявыя экспедыцыйныя матэрыялы сведчаць, што мяжа паміж гэтымі тыпамі дастаткова ўмоўная, бо большасць самагоншчыкаў выраблялa алкаголь і для асабістага спажывання, і для дадатковага заробку. Суадносіны спажывецкага і таварнага кампанентаў вызначаліся наяўнасцю рынкаў збыту, даступнасцю алкагольных напояў прамысловай вытворчасці і ступенню актыўнасці мясцовых уладаў у сферы процідзеяння самагонаварэнню. Пастановы «Аб узмацненні барацьбы з п'янствам і аб навядзенні парадку ў гандлі моцнымі спіртнымі напоямі», якія выходзілі амаль кожнае дзесяцігоддзе, прадугледжвалі скарачэнне колькасці пунктаў продажу спіртнога, што, у сваю чаргу, выклікала рост вытворчасці самагону і яго рэалізацыю.

Праблема значэння і ролі самагонаварэння ў сістэме жыццязабеспячэння паваеннай беларускай вёскі разглядаецца ў айчыннай этналогіі ўпершыню. У якасці крыніц выступілі матэрыялы вуснай гісторыі, якія дазваляюць зразумець дынаміку разглядаемай праблемы і зафіксаваць пэўную карціну, створаную калектыўнай памяццю насельніцтва Віцебшчыны. Геаграфія даследавання – тэрыторыя Беларускага Падзвіння – абумоўлена тым, што Віцебшчына ў пасляваенны час умоўна падзялялася на дзьве соцыякультурныя зоны (заходнюю і ўсходнюю), дзе працэсы калгаснага будаўніцтва мелі непадобную гісторыю і адбываліся з рознай інтэнсіўнасцю. Такім чынам, Віцебшчына ўяўляе сабой даволі тыповую мадэль, уласцівую для ўсёй Беларусі, калі падзел на "заходнікаў" і "ўсходнікаў" застаецца актуальным для нашага часу. Храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць перыяд паваеннага аднаўлення сельскай гаспадаркі, прымусовай калектывізацыі ў заходніх раёнах Беларусі, калі адбываецца разбурэнне традыцыйнага сялянскага ладу жыцця. За верхнюю мяжу разглядаемага перыяду можна ўмоўна прыняць 1966 год, калі Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 18 мая 1966 года «Аб павышэнні матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў у развіцці грамадскай вытворчасці» былі скасаваны "трудадні", як натуральная сістэма аплаты за працу калгаснікаў, і вёска ў большай ці меншай ступені была ўключана ў савецкую мадэль таварна-грашовых адносін. Адначасова адбываецца, хай сабе шмат у чым і фармальнае, ураўнанне сацыяльных правоў сялян і гарадскога насельніцтва; аб'ектыўна ўзнімаецца ўзровень жыцця беларускага сяла, што дазваляе разглядаць другую палову 1960-х – пачатак 1990-х як асобны перыяд у развіцці беларускай савецкай вёскі.

**Асноўная частка.** Пасля вайны, ва ўмовах таварнага дэфіцыту, адсутнасці грашовых сродкаў і карткавай сістэмы забеспячэння, **самагон стаў хадавой валютай падчас нелегальных тавараабменных аперацый**. Рэспандэнты ўзгадваюць, што на самагон менялі хадавыя тавары, якія нельга было вырабіць у хатніх умовах. Нават тыя, хто не ўжывалі самагон, гналі яго адмыслова, каб потым вымяніць на патрэбныя рэчы. Пэўная частка самагона, прызначанага на продаж, накіроўвалася ў гарады і мястэчкі. Улічваючы, што самагонаварэнне было забаронена і каралася жорстка, абмен адбываўся таемна, на рынках, дзе прадавалі яйкі, малако і іншыя прадукты. У першыя пасляваенныя гады прадаўцы і пакупнікі самагону загадзя ўдакладнялі і дамаўляліся наконт часу і месца продажу: *”Яна ж ідзе на базар. Таргуець. Яны і папросяць: “Ты мне ў такую та хату прынясі, дамоў”. Гналі з бульбы, зярно прарошчвалі. Баня стаяла пад ракой, там і гналі. Мама насіла ў Дрысу. Занясець у хату знаёмым жыдам бутылку ці дзве і на мыла там, на соль, на табаку, запалкі. Гэтага не было ў магазінах. Плацілі тым жа, што яна прасіла*” (Верхнядзвінскі р-н)[1].

Распаўсюджанай была сітуацыя, калі вытворцам самагону неслі сыравіну – зерне ці буракі – для вырабу пэўнага аб’ёму саматужнай гарэлкі. У гэтым выпадку было два сцэнарыя развіцця падзей: 1) вясковец атрымліваў напой, каб потым самастойна выкарыстоўваць яго ў тавараабменных аперацыях ці для асабістых патрэб, але пры гэтым частка сыравіны ішла як плата за паслугі вытворцаў; 2) самагоншчыкі за сыравіну расплочваліся нейкімі паслугамі ці вымененымі на самагон таварамі, але ўжо з пэўнай нацэнкай: “*Вырасцім буракі сахарныя, а затым ім, а яны гарэлку гоняць.* – Каму прадавалі? – *Так гэта дзеравенцам, каторыя багата жылі, каторыя грошы маглі плаціць, а мы ім плацілі буракамі.* – А чаму яны былі багатыя? – *Мужыкі былі, у ў нас нікога. Семена даставалі абыяк, хто дасць ці выпрасім. Людзі пасля вайны пакуль схваціліся, трудно было. Мы ім буракі, а яны нам боты ці плацця. Буракоў сеялі много, бо зерна не было. Яны нагоняць самагонкі і прадаюць*” (Полацкі р-н)[2].

Ва ўмовах таварнага дэфіцыту і калгаснай сістэмы разліку працаднямі[3] **самагон быў рэальнай крыніцай для заробку грошай**: “*Трэба было жыць. Прадавалі (самагон) па-троху. Хлеба не за шта купіць, ні мукі купіць, нічога не было пасля вайны. Во як жылі. Дарма робілі. Калок і калок не запішыць, трудадзень. Во як*” (Расонскі р-н)[4]. У сярэднем за бутылку (0,5 л.), па ўспамінах рэспандэнтаў, на мяжы 1940–1950-х гг. можна было атрымаць адзін рубель. Трацілі заробленыя нелегальным промыслам грошы звычайна на абутак ці адзенне, набыццё хатняй жывёлы ці прамысловых тавараў: “*Нада была дзяцей у школу атправіць, і сабе што-небудзь купіць на ногі, голые ж не ходзілі*” (Сенненскі р-н)[5]; “*Некалі і ў гарад вазіла, да якое вазіла – насіла на плячох. Ехала к знакомым, а ў іх палучка, знаю калі палучка і еду. На целую цялушку нанасіла, а тады купіла цялушку і з таго зажывалі”*(Расонскі р-н)[6]; “– А нашто гналі тую самагонку? – *Прадавала. Во, прыходзюць пьяніцы і купляюць, дзеравенскім, хто прыхадзіў – таму і прадавала.* – Грошы навошта вам былі? – *Гналі, прадавалі, а грошы сабіралі. Купілі кароўку за гэтыя грошы, адзеваліся мы ўдзвюх з ею (з сястрой – аўт.), адзеваліся добра… З Латвіі карову прывялі. Паехала ўжо з грашамі за гарэлку.*” (Шумілінскі р-н)[7].

Практычна за ўсе паслугі гаспадарчага плану (узворванне прысядзібнага участка, дапамога ў будаўніцтве, дастаўка дроваў, арэнда цяглай сілы – каня і т.п.) ва ўмовах адсутнасці ці дэфіцыту грашовых сродкаў сяляне разлічваліся “вадкай валютай”. “ – Ці было, што можна было бутылкай расшчытацца? – *Расшчытываліся. Было. Еслі надо – папросіш, што памагчы зробіць. Бутылкай і цяпер тое самае. Магазінную не куплялі, усё время гналі*” (Полацкі р-н)[8];*“Да, расшчытацца за работу. Вось нада дроў прывязці – сані нада, нада ж за сані заплаціць, нада прывязці, нада за дровы заплаціць – за ўсё нада было заплаціць”* (Верхнядзвінскі р-н)[9]. *“Расшчытываліся за ўсе: хто агарод узарэць, хто каня дасць, хто і дроў прывязець, хто це парэжыць”*[10] (Вярхнядзвінскі раён)*; “Нада ж было дровы прывязці, лясніка напаіць, нада ж гэтак вот бутылку, а дзе накупляессі гэтых бутылак”* (Пастаўскі р-н)[11].

---

[1]Запісана аўтарам (ЗА) у 2018 г. ад Снежын Станіславы Грыгор’еўны, 1923 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.
[2] ЗА у 2018 г. ад Гураўчанка Валянціны Грыгор’еўны, 1928 г.н. у в. Махірова (нар. у в. Асяродкі) Полацкага р-на.
[3]Працадзень – мера працы і мера спажывання ў сельскагаспадарчай арцелі. Праўленнем калгаса і агульным сходам калгаснікаў зацвярджаліся па ўсіх сельскагаспадарчых работах нормы выпрацоўкі і расцэнкі кожнай работы ў працаднях. Кожная работа ацэньвалася ў працаднях у залежнасці ад кваліфікацыі, складанасці, цяжкасці. Пасля заканчэння гаспадарчага года даходы размяркоўваліся паміж членамі арцелі па працаднях.
[4]Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ): Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2016 г. ад Селезнёвай Лідзіі Аляксандраўны, 1929 г.н., у в. Кульнева Расонскага р-на.
[5]ФА ПДУ: Зап. Жэгула К. у 2018 г. ад Казловай Ніны Грыгор’еўна, 1929 г.н. (нар. хут. Собалі Сенненскага р-на) у г. Віцебск.
[6]ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2016 г. ад Малахавай Соф’і Фёдараўны, 1936 г.н. (нар. у в. Сядлова) у в. Кульнева Расонскага раёна.
[7]Зап. Корсак А. І., Сумко А. В. у 2018 г. ад Барсысевіч Розы Людзвігаўны, 1928 г.н., у в. Нікіціха Шумілінскага р-на.
[8]ФА ПДУ: Зап. Лобач У.А., Сумко А. В. у 2018 г. ад Маісеенка Марыі Філіпаўны, 1931 г.н (нар. у в. Селігоры), у в. Мураўшчына Полацкага р-на.
[9]ЗА 2018 г. ад Трапук (Яновіч) Зінаіды Васільеўны, 1932 г.н., у в. Азернікі Верхнядзвінскага р-на.
[10]ЗА у 2018 г. ад Шамёнак Клаўдіі Аляксееўны, 1932 г.н., у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.
[11]Зап. Грэбень Я. А., Корсак А. І., Сумко А. В. у 2017 г. ад Грыбко Марыі, 1922 г.н. у в. Пятроўшчына Пастаўскага р-на.

**Інтэнсіўнасць барацьбы з самагонаварэннем** і прыцягненне вінаватых да розных форм адказнасці (адміністрацыйнай ці крымінальнай) залежала ад сацыяльна-эканамічнага і палітычнага становішча ў краіне. У разглядаемы перыяд праводзілася некалькі антыалкагольных кампаній, якія суправаджаліся ўзмацненнем актыўнасці мясцовых уладаў і участковых міліцыянераў па ліквідацыі эканамічнай базы сельскай вытворчасці самагону. У першыя пасляваенныя гады, ва ўмовах карткавай сістэмы забеспячэння і моцнага дэфіцыту прадуктаў харчавання, самагонаварэнне разглядалася як дзейнасць, якая наносіць сур'ёзны ўрон народнай гаспадарцы і дабрабыту савецкіх грамадзян, бо саматужныя алкагольныя напоі рабіліся з каштоўных прадуктаў харчавання – збожжа, буракоў, бульбы і г.д. Выраб самагонкі нярэдка спалучаўся з крадзяжом зыходных прадуктаў у калгасе, а яе продаж станавіўся крыніцай непрацоўных даходаў, што супярэчыла сацыялістычным каштоўнасцям. Асаблівы размах самагонаварэнне набывае пасля грашовай рэформы і адмены карткавай сістэмы ў снежні 1947 г. [3, л. 7]. У адказ на гэта 7 красавіка 1948 года быў выдадзены Указ Прэзідыума Вярхоўнага савета СССР “Аб крымінальнай адказнасці за выраб і продаж самагону”. Указ зрабіў больш жорсткімі санкцыі за самагонаварэнне, у тым ліку за выраб самагонных апаратаў з мэтай збыту, а таксама ўсталяваў крымінальную адказнасць за выраб самагонкі без мэты збыту, за што раней прадугледжвалася адміністрацыйная адказнасць [2, с. 5]. У Полацкай вобласці за 1948 года да судовай адказнасці за самагонаварэнне і збыт нелегальнага алкаголю было прыцягнута 673 асобы [3, л. 7]. У прыватнасці, было канфіскавана 120 самагонных апаратаў, 404 літра самагону, 618 ведраў брагі, на выраб якой пайшло амаль 3 тонны сельскагаспадарчай прадукцыі (жыта, бульбы, буракоў). Пры гэтым, як адзначала пракуратура Полацкай вобласці, найбольшы размах самагонаварэнне мела ў заходніх раёнах, дзе яшчэ ў дастатковай ступені захоўваліся аднаасобныя гаспадаркі, якія мелі дастатковыя рэсурсы для вырабу хатняй гарэлкі.

Найбольш рэзанансныя справы знаходзілі адлюстраванне ў перыядычным друку. Так, напрыглад, у газеце “Чырвоны сцяг” (орган Відзаўскага РК КП(б)Б і райсавета дэпутатаў працоўных) ад 22 ліпеня 1948 г. адзначалася, што органамі пракуратуры раёна быў прыцягуты да адказнасці шэраг асоб, якія сістэматычна займаліся самагонаварэннем, сярод іх “жыхарка гор. пасёлка Відзы Шматкова С.Х., якая на працягу 2-х год занімалася вырабам і збытам самагону, за што асуджана Відзаўскім нарсудом да 9 год пазбаўлення волі”, а таксама пералічваліся тыя, хто яшчэ толькі будуць прыцягнуты да адказнасці [4]. У межах усёй рэспублікі, у сувязі з барацьбой з самагонаварэннем, у 1948 г. было ўзбуджана 5,5 тыс. Крымінальных спраў (у 1947 г. – каля тысячы) [5, с. 238]. Судовая статыстыка фіксавала, што для вырабу самагонкі без мэты збыту ў 94,6% выпадках выкарыстоўваліся прадукты ўласнай гаспадаркі і толькі ў 5,4% выпадках прадукты купляліся на рынках ці ў гандлёвых арганізацыях [6]. Аднак прыведзеная статыстыка не ўлічвае тых аб’ёмаў сыравіны, выкарыстанай для вырабу самагону, якія былі скрадзены сялянамі ў калгасе. Акрамя гэтага, з агульнай колькасці асуджаных за самагонаварэнне пераважная большасць была асуджана за выраб самагону для асабістых патрэбаў, а не з мэтай збыту.

Вялікія аб’ёмы вырабленага самагону і запатрабаванасць яго на рынку спарадзілі інстытут пасрэднікаў (перакупшчыкаў), якія атрымлівалі прыбытак за перапродаж алкаголю. Так, напрыклад, у 1948 г. была асуджана да адбывання пакарання ў працоўных лагерах жыхарка Браслаўшчыны Крутава Е.І., якая сістэматычна займалася скупкай і перапродажам самагону, пры вобшуку ў якой была выяўлена вялікая сума грошай і шмат самаробнага алкаголю [3, л. 7]. Архіўныя даныя адносна перакупшчыкаў знаходзяць падцверджанне і ў матэрыялах вуснай гісторыі: *“Гналі ціханька. Пасля вайны хаділа на рынак у Бігосава і ў грелке, на жывот прівяжет. А там у неё была падруга. Ана падруге прінесёт, та, естественна, ей заплаціт сколькі там і прадаст”*[12] (Верхнядзвінскі р-н).

Аднак барацьба з самагонаварэннем, як правіла, насіла характар кампанейшчыны, калі асаблівая актыўнасць па выкрыцці і пакаранні самагоншчыкаў абмяжоўвалася годам, калі выходзіў адпаведны указ Вярхоўнага Савета СССР. У наступныя гады лічбы прыцягнутых да адказнасці за нелегальны выраб алкаголю значна падалі. Так, ужо ў 1949 г. за самагонаварэнне было пакарана 458 асоб, а ў 1950 г. – 322 чалавекі [7, л. 50]. Пры гэтым самагоншчыкі выпрацоўвалі сваю тактыку пазбягання крымінальнай адказнасці – віну на сябе бралі жанчыны альбо інваліды, пакаранне якіх было мінімальным. Гэтую акалічнасць адзначалі і органы пракуратуры, якія наракалі на недастатковыя меры па барацьбе з самагонаварэннем: “Работа па выяўленню асоб, якія займаюцца самагонаварэннем не праводзіцца. У выніку чаго да адказнасці за выраб самагону прыцягваюцца падстаўныя асобы, што маюць сур’ёзныя фізічныя хібы” [8, л. 12]. У той жа час большасць рэспандэнтаў адзначае, што самагонаварэнне мела татальную распаўсюджанасць у паваеннай беларускай вёсцы: “ – Самагонку гналі? – *Гналі. Радіцелі для сябе. Не прадавалі. Все гналі. Пасля вайны сеялі гароды, жыта”*[13] (Пастаўскі р-н)*; “Кажэн, кажэн гнаў. У нас і баня цяпер стаіць, у прадбанніку (гналі)”* [14] (Пастаўскі р-н).

[12] ЗА у 2018 г. Немянёнак Ванды Міхайлаўны, 1936 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.
[13] ЗА у 2017 г. ад Пайлак Надежды Іванаўны, 1935 г.н. у г.п. Варапаева Пастаўскага р-на.
[14] Зап. Грэбень Я. А., Корсак А. І., Сумко А. В. у 2017 г. ад Грыбко Марыі, 1922 г.н. у в. Пятроўшчына Пастаўскага р-на.

1 верасня 1959 года Прэзідыум Вярхоўнага савета БССР выдаў Указ "Аб узмацненні барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем", які значна змякчыў крымінальна-прававыя санкцыі за захоўванне самагону і самагонных апаратаў, аднавіў адміністрацыйную адказнасць за выраб самагонкі незалежна ад наяўнасці мэты збыту [2, с. 6]. У 1960 годзе быў прыняты новы Крымінальны кодэкс БССР, адказнасць за самагонаварэнне ў ім прадугледжваў артыкул 155. Крымінальная адказнасць наступала за выраб самагону або апарата для самагонаварэння (здзейсненае пасля прымянення да вінаватага мер грамадскага ці адміністрацыйнага ўздзеяння за аналагічныя дзеянні) і за збыт самагону або апарата. Кодэкс быў уведзены ў дзеянне 1 красавіка 1961 года, а 15 мая 1961 года быў выдадзены Указ Прэзідыума Вярхоўнага савета СССР "Аб узмацненні адказнасці за самагонаварэнне" [2, с. 6]. Гэтым указам была ўведзена адміністрацыйная адказнасць за набыццё самагону і ўнесены змены ў артыкул 155 КК БССР. За ўсе разнавіднасці самагонаварэння, нават за захоўванне самагону без мэты збыту ўстанаўлівалася крымінальная адказнасць.

**Самагоншчыкі і органы ўлады.** Нягледзячы на нелегальны характар самагонаварэння і даволі жорсткія карныя санкцыі, прадугледжаныя законадаўствам, узаемадносіны сялян і мясцовых уладаў (у тым ліку міліцыі і калгаснага актыву) былі даволі супярэчлівымі. У шэрагу выпадкаў, "бескампраміснасць" участковага і ягоных памагатых (дружыннікаў) можна разглядаць як барацьбу з "канкурэнтамі" ў сферы вытворчасці нелегальнага алкаголю:"- Самагон гналі раней? Для себя ці на абмен?- *Для сябе. Пасля вайны гналі і цяпер.* - А міліцыя ганяла? - *А как же, штрафалі, в тюрьму садзілі. Два гады далі Ганэрыку. Міліцыя славіла. Пасля вайны вярнуўся рука перабітая была – інвалід. На месцы участковы быў, дружыннікі ў вёсцы былі. Дружыннікі самі самагонку гналі, ну яны нікога не баяліся.* - А чаго не баяліся?- *Вмесе пілі – адна кодла. Гэтыя як разведчыкі, памочнікі ягоныя. Участковы прыдзець, так я яго баюся, а свойго чалавека я не баюся, я яму давераю"* (Пастаўскі р-н) [15].

Аднак у выпадках, калі размова ішла пра падзеі ці ўрачыстасці, знакавыя і важныя як для асобнага чалавека, так і для ўсяго вясковага калектыву, калгаснае начальства само санкцыянавала выраб самагону і вылучала неабходную сыравіну для яго вырабу: " – А ці было можа, каб хто-небудь прадаваў? – *Не, толькі для сябе. Калі гулянкі. Дажа, калі Кемстач (старшыня калгасу – аўт.) стаў работаць, усегда делалі п'янкі, што зробіць субботнікі, так абязацельна гулянкі. Самагонку ездзілі па дзярэўнях дажа куплялі. У нас тут дужа не займаліся, а па людзях ездзілі і куплялі канкі (1 канка – 30 літраў). Дзве купім і гулянку гуляем.* – Так гэта начальства калхознае пакупала, штобы людзей угасціць? – *Да. Начнецца жыта жаць, затым абязацельна абжынкі. Даже без ніякіх нічога. Заканчваецца касенне і тут гулянку справіць. Ён плаціў, каб людзі шлі*" (Полацкі р-н)[16];"*А гэта ўжо як былі калхозныя абжынкі ў каждай брыгадзе. Гэта тады ўжо **брыгадзір дасць якому мужыку жыта зерна, (той) самагонкі нагоніць**. Ну і тады тожа сабіраліся*"(Глыбоцкі р-н)[17]; "*Гналі, хто гнаў, а хто не гнаў, а хто і купляў. А тады як ужо папаўся та гарэлка выйдзць у пяць дарагоў.* – А бальшыя штрафы былі?– *Да, даказвалі дужа за гэта дзела. Ну, еслі дакажаш, што гэта прымерна там на свадьбу, то **разрашэнне нада было** ілі на пахараны.* – Тады можна было выгнаць? – *Да, але многа нельзя было.* – А колькі, напрыклад, на свадьбу? – *Ну, на свадьбу ўсяк можна здзелаць і на 50 літраў нагоняць, а могуць і за 10 літраў, якая там свадьба будзець, ні туды, ні сюды*" (Шумілінскі р-н)[18]; "*Самагонку гналі ўсе. Дажа разрашалі на собственные целі*" (Пастаўскі р-н)[19]. Падобныя выпадкі, калі старшыня калгасу дазваляў гнаць самагон з нагоды важнай жыццёвай падзеі, не зважаючы нават на прадстаўніка праваахоўных органаў, фіксуюцца і ў іншых рэгіёнах Беларусі: "Вот у шэйсятым годзе бацька памер. Пайшоў я да прадседацеля калхоза, каб помашч якую… Сядзіць участковы ў кабінеце ў прадседацеля калхоза. Ён мне пейсят кілаграм – гэта тры пуды зярна. Кажыць: – Змеліш! Самагоншчык, ты сам зробіш чарачку, – кажа, – і прыпомніш бацьку. Вот. А ўчастковы: – Да разве эта так можна? – на прадседацеля. А я кажу: – Што я, абазваў злодзеям, бандзітам? Я ж не абазваў. Але як пяюць, так і адпяваюць. Раз ён папытаўся не па-чалавечыску, дык я адвеціў яму ні па-чалавечаску. Я з табой не разгаварываю, – гавару, – я разгаварываю з прадседацелем калхоза!" (Вілейскі р-н) [9, с. 501].

Некаторыя рэспандэнты ўзгадвалі, што міліцыянеры і самі спажывалі саматужна выраблены алкагольны напой, якім іх частавалі сяляне з абсалютна пэўнай мэтай: "*А я дажа міліцыянерам давала гарэлку купляць. Адны міліцыянеры ганялі, а другія…гэта пасьля вайны. А раз там аварыя была ў Мішкавічах, дык яны зайшліся: "Людвігаўна, нада вот выпіць". Я ім бутылку бу-бух на стол, а яны:*

[15] Зап. Грэбень Я. А., Корсак А. І., Сумко А. В. у 2017 г. ад Альфер Антона Сцепанавіча 1929 г.н. у в. Груздава Пастаўскага р-на.

[16] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2018 г. ад Маісеенка Марыі Філіпаўны, 1931 г.н. (нар. у в. Селігоры) у в. Мураўшчына Полацкага р-на.

[17] ФА ПДУ: Зап. у 2012 г. Лобачам У. А., Аўсейчыкам У. Я. ад Сівіцкай Крысціны Мікалаеўны, 1940 г.н. у в. Гулідава Глыбоцкага р-на.

[18] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2018 г. ад Коцікавай Надежды Ісакааўны, 1932 г.н. у в. Сіроціна Шумілінскага р-на.

[19] ЗА у 2017 г. ад Лабанавай Валянціны Сямёнаўны, 1938 г.н, у в. Васіліны Пастаўскага р-на.

*"Ну, за гэтую гарэлку судзіць нельзя, яна крэпкая" (смяецца). Толькі грошы не плацілі…міліцыя, калі п'ець. А я ім стаўлю, каб яны мяне не чапалі*" (Шумілінскі р-н)[20].

У сітуацыі з вясковым вяселлем участковыя міліцыянеры, асабліва з ліку тутэйшых, папросту заплюшчвалі вочы на нелегальны выраб самагону: " – А за самагон ці ганялі? – *Ну ж, за гару насілі. Раз прыйшоў адзін міліцыянер – напаілі, паспасібаваў і пайшоў. Усе зналі. А дзе купляць? Падумай дзве свадьбы справіць за два месяцы!"*(Верхнядзвінскі р-н)[21]. Разам з тым, барацьба з самагонаварэннем магла прымаць і незаконныя, нават злачынныя формы: "*А ў Захарнічах, в обичэм, прадавала адна дачка ў бацькі самагонку. Ён гнаў самагонку, яна насіла ў горад, прадавала, у Баравуху. І міліцыянер яе паймаў, як яна нясла, ну і нада было судзіць. А гэта, яна стала плакаць, прасіцца. А ён гаворыць: "Ну раз такое дзела, ну сагласісь са мной…" І яна сагласілася. Асталася ў палажэнні. Ну а ў палажэнні – эта ж не цяпер, а раньшэ – які пазор быў. Усё, неізвесна, які пазор! На ўвесь род. І яна забрала ў галаву, забрала, і павесілася. Нічога не сказала*" (Полацкі р-н) [10, с. 214].

З другога боку, самагоншчыкі выяўлялі зайздросны спрыт і ўвішнасць з тым, каб пазбегнуць адказнасці за свой нелегальны і прыбытковы промысел. Як правіла, вельмі ўмела выкарыстоўваліся асабістыя хібы ўласна ўчастковых, а менавіта іх схільнасць да спажывання алкаголю. Часам канфлікт і далейшае паразуменне паміж прадстаўніком улады і самагоншчыкам насілі трагікамічны характар. Адзін з такіх выпадкаў быў запісаны ў вёсцы Казімірова Полацкага раёна. Жыла там жанчына, якая будавала дом, а самагон выкарыстоўвала ў якасці разліку за паслугі: "*Заявілі. Узялі панятных. Прыйшлі і знайшлі самагонку. Яна напаіла гэтага ўчастковага, так напаіла, што і панятныя напіліся, і самі напіліся – ўсе. І заснуў, акт злажылі, усё, а ён заснуў у её. Яна ўзяла з кабуры пісталет выняла і ўсё. І вот… а тады добра далі бы. Ён устаў, цоп-цоп – нет пісталета. Ён адразу да яе, а яна: "Парві акт – аддам, не парвеш – табе больш будзе. Ты прыйшоў, панятных спаіў, самагонку найшоў, напіўся сам да бессазнанія, не то што ты в прімер паставіл, а ты сам напіўся, а я ў цябе ўкрала пісталет. Вот якая ваша міліцыя!" Круціўся, круціўся, як не прасіў. – Не дам і ўсё. Табе больш будзе, мяне можа апраўдаюць, а табе больш будзе – не бярог ты сваё аружые. Вот і ўсё. Круціўся, круціўся і аддаў. Парвала, парвала: "Вось цяпер на табе твой пісталет, ідзі, не хадзі сюды больш"*[22].

**Самагон як хабар.** У адсутнасці грашовых сродкаў самагонка ўваходзіла ў "прадуктовы набор", які ў выглядзе хабара дазваляў вырашаць разнастайныя жыццёвыя праблемы на карысць вяскоўца. "*Мама, чтобы сястра не работала ў калхозе (нада ж было узяць яе аттуда), мама нагнала самагонкі, калбас сахраніла, кагда парасенка зарэзала, і праўленню калхоза (дзядя быў член праўлення калхоза) ана отнесла ему туда і самагонкі, отнесла туда калбас эціх. Он эціх членаў правленія напаіў, угасціў і тагда далі спраўку – с колхоза выпусцілі. Ну, пад какім предлогом там, я не знаю, но Люда пашла работаць в Верхнедвінск*"[23]. Гэткі ж набор прадуктаў (сала, кілбасы, самагон) мог фігураваць і як падзяка за аказанне медыцынскіх паслуг на належным узроўні, што, аднак, трактавалася органамі пракуратуры як хабар. Так, у 1948 г. загадчык Мёрскай бальніцы Вавнута Н.В. быў абвінавачаны ў тым, што за аказанне медыцынскай дапамогі атрымліваў ад насельніцтва хабар у выглядзе самагона, сала і кілбас. Памеры "пачастунку", як гэта бачна на прыкладзе паднашэння з боку Бялевіча І.С., складалі два літра самагону, 4 кг сала, 4 кг кілбасы [3, л. 7]. І нават калі ў сялян з'явіліся грашовыя сродкі, з дапамогай якіх можна было вырашаць канфліктныя сітуацыі з прадстаўнікамі ўлады, самагон па-ранейшаму складаў абавязковую частку хабару: " – З участковым можна было дагаварыцца? – *Ну, гэта можна было. Гэто тожэ немалыя срэдства нада была палажыць.* – Так гэта грашыма ці гарэлкай? – *Ён гарэлкі нап'ецца і будзе табе гаварыць – усё, а тады апяць сваё. І гарэлкай, і грашамі давалі. Не адкажацца. Ого, была ўсяго.* – Так гэта свой, сіроцінскі, быў? – *Не, прыязджалі з Шуміліна, назаначана па-нашаму, тады ж і слядзіць за гэтым, а калі паступіць заяўка, тады ён прыедзіць*" (Шумілінскі р-н)[24].

**Самагонаварэнне ў сацыяльнай праекцыі.** Нягледзячы на забарону, самагонаварэнне трывала ўвайшло ў жыццё вясковага соцыўма, што падцвярджаюць матэрыялы вуснай гісторыі. Самагон выступаў як рэгулятар сацыяльных паводзін. Рэспандэнты ўзгадваюць, што "*дзярэўня бальшая была (в. Адворня, Ушацкі раён – аўт). У ніх так заведзена: сягоння ты гоніш самагонку, заўтра – ён. Сягоння ён ідзе к табе піць, заўтра – ты. Па стакану гакнулі, паўтарылі і ўжо вінтом дамоў. Первак есць первак. Шчытай чысты спірт. Кажны сасед знаў, вот усе ругаліся, но за самагонку ніхто нікога не прадасць. Ты сягодня прыйшоў ка мне, ну, там бабы ў асноўным рукавадзілі, дай бутылку, мне нада. Табе дадуць бутылку ў залог. Ты выганіш і прынясеш, аддасі. А вось, каб выдаць,павешай, не скажуць*"[25].

---

[20] Зап. Корсак А. І., Сумко А. В. у 2018 г. ад Барсысевіч Розы Людвігаўны, 1928 г.н., в. Мікіціха Шумілінскага р-на.
[21] ЗА у 2018 г. ад Быкавай Яніны Барысаўны, 1932 г.н. у в. Зябкі Верхнядзвінскага р-на.
[22] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2016 г. ад Палавой Маі Паўлаўны, 1937 г.н. у в. Казімірова Полацкага р-на.
[23] ЗА у 2018 г. Немянёнак Ванды Міхайлаўны, 1936 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.
[24] ФА ПДУ: Зап. Лобач У.А., Сумко А.В. у 2018 г. ад Коцікавай Надежды Ісакааўны, 1932 г.н. у в. Сіроціна Шумілінскага р-на.
[25] ЗА у 2018 г. ад Снежына Валерыя Фёдаравіча, 1951 г. н. , в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

Нелегальны характар вырабу самагону ў пэўнай ступені інтэграваў вясковы калектыў, які быў зацікаўлены ў вырабе забароненага прадукту. "Агульная таямніца" выразна супрацьпастаўляла вясковую грамаду мясцовым уладам і дазваляла паспяхова пазбягаць пакарання: "*Тайна, ноччы. За кладбішчам, у Каркальцы, там куст быў і вада на месце, там балота было. Ну, дак самагонку гналі і хату строілі. Не сдалі ніхто? Не здалі. Там уся дзярэўня гнала. 22 хаты было і дзярэўня настаяшчая была. Дзярэўня ў лясу была. Цяпер можа і здалі. А чаму тады не здавалі? Тады людзі былі гаратныя, але яны дружныя былі. А цяпер яны пазвярэлі ўжо ад багатства*"[26]. Разам з тым такая сітуацыя была характэрна для адносна невялікіх весак, аддаленых ад буйных населеных пунктаў ці бальшакоў, дзе склад насельніцтва збольшага не змяняўся. Неабходна адзначыць, што ў Віцебскай вобласці дробныя вёскі складалі больш за 80% агульнага ліку сельскіх паселішчаў вобласці [11, с. 250], а значная частка іх знаходзілася ў цяжкадаступных лясных мясцовасцях. Аднак з 1960-х гг. назіралася ўстойлівая тэндэнцыя памяншэння колькасці сельскіх паселішчаў за кошт скарачэння так званых неперспектыўных вёсак і перасялення іх жыхароў. "*З Каркальца пераганялі на большыя дзярэўні. Снасілі малыя дзярэўні. Дарогу нада было там строіць, а так хадзілі па калена ў гразі*"[27]. У выніку людзі траплялі ў новае асяроддзе, дзе сацыяльныя сувязі былі не такімі моцнымі і звычайнай з'явай былі выпадкі, калі суседзі маглі заявіць уладам на самагоншчыка. "*Ганялі, каб жа ж не ганялі...брагу дажа вылівалі вон. Заложаць і прыдуць. На дровы мне быў сын выгнаўшы ў бані. І вот гэта саседка, яна даказала і мне 150 рублей штрафу далі і ў газету напісалі*"[28].

**Самагон у абрадавым жыцці беларускай вёскі.** З аналізу палявых экспедыцыйных матэрыялаў вынікае, што ў першыя пасляваенныя дзясяцігоддзі без самагону не абыходзілася ніводнае свята як каляндарнага, так і сямейнага цыклу: "– А вот святы, якія бываюць, празнікі гадавыя вялікія такія? – *Начыная з Раждзества, тады Хрышчэнне, тады гэта Грамніцы, тады ўжо пачынаецца Пасха, тады Троіца. Многа жа было гэтых бальшых празнікаў. А маленькія чуць не кажды дзень.* – А самыя главныя былі? – *Главныя так Раждзество, Пасха і Троіца. Гэта самыя главныя празнікі былі.* ***Там пірог пяклі і самагон гналі***" (Глыбоцкі р-н)[29]; "– А ці давалі што-небудзь валачэбнікам? – *А як жа! Давалі! Ну як што ў каго ёсць, тое і давалі.* ***Хто не пажалее, дык і бутылку самагонкі давалі***" (Глыбоцкі р-н)[30];"– А як свадьба ці пахараніць чалавека гарэлку сваю гналі? – *Сваю, хлебную. Ячмень малолі, прарасціш – змеліш, уручную. Жорны былі. Заварыш, яна выхадзіцца. Гналі. І свадьбу спраўлялі, і прашчальныя спраўлялі*" (Полацкі р-н)[31]; "– А на свадьбу, на памінкі толькі самагонку? – *Да, толькі самагонку*" (Верхнядвінскі р-н)[32]. Абавязковая прысутнасць самагону ў каляндарных і сямейных абрадах, якія паспяхова замяшчаў маладаступную крамную гарэлку, абумоўлена не схільнасцю вясковых жыхароў да алкаголю, як гэта можа падацца на першы погляд (усе інфарманты адзначаюць строга нармаваны характар спажывання алкаголю і той факт, што "хоць выпіць кожны, а работу сваю знаў"), але высокім семіятычным статусам гарэлкі ў міфапаэтычнай карціне свету славян, асабліва ў рытуалах пераходнага тыпу [12].

Рэспандэнты з Верхнядзвінскага раёну (вёскі: Жыгулі, Юсцініянава, Барсукі), калі ўзгадвалі першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, адзначалі, што самагон яны пераважна прывозілі з-за Дзвіны, якая да 1939 года была мяжой з Польшчай. Жыхары ўсходняй Віцебшчыны хадзілі на часовыя заробкі ў заходнія раёны вобласці, дзе яшчэ заставаліся аднасобнікі, а суцэльная калектывізацыя пачалася з 1949 г. Каб справіць вяселле перапраўляліся цераз Дзвіну і дамаўляліся наконт гатовага прадукту: *"І я замуж шла, у Западную насіла зярно і гналі. У Западнай было болей спакайней, у нас ганялі за самагонку. Гэта ёйнае дзела, ці яна ўзяла самагонам, ці зярном. Мы ёй заплацілі, а яна нам нагнала самагонкі"*[33] (Верхнядзвінскі р-н).

Калі дазвалялі матэрыяльныя магчымасці гаспадаркі, то сям'я абыходзілася ўласнымі сіламі ў падрыхтоўцы вясельнага застолля. "*У 55 годзе свадьба – харашо гулялі. Сваё ўсё было. Тата авечку зарэзаў. Самагонку пілі, самі гналі. Плацце белае было, у саседкі была свадьба – яна давала. Цяперака напракат, а раней пазычалі і давалі. І фата, з гэтай фатой сколька пар замуж выхадзіла.. як выхадзіла так і жылі.*" (Пастаўскі р-н)[34]. На стол падчас хрэсьбін у паваенныя гады таксама ставілі самагонку; "*Аканомія ж, не было ні прадуктаў, ні гарэлкі. Якой зробіць, тайна, як-небудзь дома. Штрафавалі. Самагонку рабілі, не знаві нічога, заваруць гэтага, зерне і бульбы натаўкуць, сахару. Ну і на гэты*

---

[26] ЗА у 2018 г. ад Трапук Зінаіды Васільевны, 1932 г.н. у в. Азернікі Верхнядзвінскага р-на.
[27] ЗА у 2018 г. ад Трапук Зінаіды Васільевна, 1932 г.н. у в.Азернікі Верхнядзвінскага р-на.
[28] ЗА у 2018 г. ад Трапук Зінаіды Васільевна, 1932 г.н. у в. Азернікі Верхнядзвінскага р-на.
[29]ФА ПДУ: Зап. Аўсейчык У. Я. у 2010 г. ад Хрол Любові Мікалаеўны, 1922 г.н. у в. Хралы Глыбоцк. р-на.
[30] ФА ПДУ: Зап. у 2012 годзе студэнтамі ПДУ Малюжанцам П., Нікалаевай Г., Краснабаевым С. ад Вышадкі Аляксандра, 1936 г.н. у в. Канстанцінава Глыбоцкага р-на.
[31]ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2018 г. ад Маісеенка Марыі Філіпаўны, 1931 г.н (нар. у в. Селігоры) у в. Мураўшчына Полацкага р-на.
[32] ЗА у 2018 г. ад Гайбут Веры Кірылаўны, 1941 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.
[33] ЗА у 2018 г. ад Шамёнак Клаўдіі Аляксеевны , 1932 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.
[34] Зап. Грэбень Я. А., Корсак А. І., Сумко А. В. у 2017 г. ад Галоўка Анны Ігнатьевны, 1935 г.н., в. Міські Пастаўскі р-н.

*хрэсьбіны. Не звалі суседзяў, нікога, толькі калі толькі брат, сестра, родных*” (Докшыцкі р-н)[35]; *“А вот мне помніцца, значыць, як эта раньше, вот если дожен радзіцца рабёнак, ага, если рабёнак родзіцца – сын, то вядро гарэлкі я пастаўлю, а если дачка, тады ўжо сколька прыйдзецца”*[36](Сенненскі р-н).

Аналагічным чынам самагон замяняў гарэлку ў пахавальна-памінальнай абраднасці: *“Я помню, што мама, калі бацька яе памёр, ну, тут сабраліся. Але тады ўжо было троху зерна і ў нас. Мама запрагла каня, бацька яе тут ляжыць дома, а нада ж самагонкі – стол. І вот яна павезла туда (у Западную – аўт) зярно і прывязла самагонкі. Ну, можа яна знала да каго ехаць. Адзін аднаму можа падскажуць. Яны прадавалі самагонку. Дагаварваліся на сколькі зерна дадуць самагонку. Я помню, што первая куцця была ячменная. Як памiралі, первы стол ставяць куццю. Мама паехала і прывязла тады ячменню, а затым паехала за самагонкай.”* (Вярхнедзвінскі раён)[37]; “..елі на памінках, што ў каго было. А едзяць, што ў каго ѐсць… Раней пшаніцу ў ступе таўклі… к памінкам. Каша і куцця абязацельна каб былі. Каша із ячных круп, масленная. А куцця далжна салодкая быць, з сахарам ці з мёдам, у каго мёд быў… ні у кога мёда не было… Первае елі кашу, патом куццю. Сразу елі кашу і куццю, хто што чэрпаў, усё разам на стол ставілі. Як ужо памянулі, елі, **самагонку** ету пілі і ўсё, тады апяць чэрпалі кашу і клёцкі – паследнія…” (Дубровенькі р-н) [13, с.157].

Самагон як абавязковы атрыбут абрадавага застолля (радзіны, вяселле, пахаванне – памінкі) атрымліваў адносную легітымнасць нават з боку мясцовых уладаў і міліцыі. Так, справа, узбуджаная ў 1950 г. у дачыненні жыхара Полаччыны Фрола І.Ф., у якога выявілі 15 літраў самагону, была спыненая пасля таго, як вясковец давёў, што нелегальны алкаголь набыў на рынку для правядзення вяселля [14, л. 212]. Аднак калі на стол, за якім знаходзілася радзіна маладых, самагон выстаўлялі без усякай засцярогі, то ў выпадку з “рагаткамі” (“загародамі”), што выстаўлялі аднавяскоўцы на шляху вясельнага поезду, адкупляліся ўжо крамнай (пакупной) гарэлкай. “ – Раней рагаткі ставілі, а на рагатку ставілі самагонку ці куплёную гарэлку? – *Тады ж самагонку не можна было. Туды купленую, а сваім на стол – гарэлку”* (Вярхнедзв. р-н)[38]; “ – А рагаткі ставілі? – *Ставілі.* – Так самагонку ці гарэлку? – *Не, тут ужо самагонку не ставілі. Баяліся. Самагонка на стале, а рагатка – гарэлка магазінная”* (Вярхнедзв. р-н)[39].

Самагонкай разлічваліся і за музычнае суправаджэнне танцаў на вячорках: *“Было кажную суботу і васкрасенье – танцы. Вот сёння мы прымерна ў Княжыцы, а заўтра ў другой дзярэўні – Хоцінічы. Мы туды ідзём гуляць. Адно васкрасенье ці субботу дзеўкі спраўляюць, а другое – мальцы. А плаціць музыканту! Ён жа дарма іграць не будзе! Сабіралі яйкі, кралі ў матак. Снімаю, схаваю к субоце. І ты, і я, і другая. Сабярэм 10 – 15 яіц. А мальцы ці бутэльку самагонкі ці грашыма”*[40]. З прыведзенай цытаты вынікае, што самагон выконваў функцыю грошай пры аплаце пэўных паслуг.

У паваенны час самагон фігуруе і ў сферы народнай медыцыны не толькі як сродак для вырабу розных лекавых настояў, але і як дзейсная субстанцыя для рэалізацыі замоўных практык: “*Дык мне самому было, зубы данялі, рады нет. Дак я на трактар сеў і тады туды паехаў к ёй. Прышоў у хату, кажу: “Манька, загавары ты мне, каб зубы не балелі”. Яна троху пастаяла, падумала, а тады пайшла ў трысцен, прыносіць мне стакан самагонкі. Ну я выпіў, сядзім, разгаварываем. Яна пашла і другі прынясла, ну і ўсё, я прыехаў назад. І з таго мне зубы не балелі. І патом, што былі тут яны, во толькі два асталася, астальныя яны павыламаваліся, а гэтых пярэдніх чатыры так проста з карнямі, дзясны агаліліся. Павыламываліся, а не балелі. Вот цябе і загавор. Памагло.*” (Ушацкі р-н)[41]; *“Ну выехалі, яшчэ серанька на дварэ было, ну і паехалі. Прыехалі туды.., а ён за меня: “Садзісь, галубачка, садзісь, садзісь”. Пасадзіў мяне, сперва ў дзверах нешта там шаптаў, шаптаў, шаптаў, а тады пасадзіў у чала ў печку, там нешта, нешта шаптаў усё. “А цяпер, – гаворыць, – раздзевайся быстранька, ну і лажыся”. Ну, я сняла валёнкі, сняла шубу, пашла, легла. А я самагонку з сабой брала, налілі мне паўстакана самагонкі, там ета ўсё загаварыў і сказаў: “Пастарайся як-небудзь заснуць”. Ну, праўда, пакамест яны там абедалі, спраўляліся, я заснула”* (Віцебскі р-н)[42].

Патрэбна адзначыць, што самагон (а пазней – гарэлка) выступаў неадменным атрыбутам так званага “барыша”, які неабходна было выпіць, каб замацаваць і канчаткова аформіць важную для вяскоўца гандлёвую здзелку (напрыклад, набыццё каровы ці каня) з тым, каб куплены тавар не пайшоў на марна ў новых гаспадароў: “ – Раней казалі, што калі цялушку пакупалі пілі барыш ці так? – *Пілі.*

[35]ФА ПДУ: Зап. Шыпіла Н., Путронак К., Жахоўскі Б. у 2009 г. ад Васілевіч Галіны Іосіфаўны, 1927 г.н. у в. Несцераўшчына Докшыцкага раёна.

[36]ФА ПДУ: Зап. Жэгула К. у 2018 г. ад Казловай Ніны Грыгор’еўна, 1929 г.н. (нар. хут. Собалі Сенненскага р-на) у г. Віцебск.

[37] ЗА у 2018 г. ад Гайбут Веры Кірылаўны, 1941 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[38] ЗА 2018 г. ад Трапук Зінаіды Васільевны, 1932 г.н. у в. Азернікі Верхнядзвінскага р-на.

[39] ЗА у 2018 г. ад Шамёнак Клаўдіі Аляксеевны , 1932 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[40]ФА ПДУ: Зап. Захарэвіч А. у 2008 г. ад Балуцінай Еўфрасінні Афанасеўны, 1921 г.н. (нар. у в. Горбава Лёзненскага р-на) з 1971 г. у в. Княжыца Віцебскага р-на.

[41] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. у 2006 г. ад Бугая Васіля Тарасавіча, 1926 г.н. і Анастасіі Якаўлеўны, 1935 г.н. у в. Царкавішча Ушацкага р-на.

[42] ФА ПДУ: Зап. Валодзіна Т. і Лобач У. у 2007 г.ад Хляханавай Марыі Фёдараўны, 1930 г.н. у в. Слабада Віцебскага р-на.

*Барыш пьюць.* – А зачэм? І хто яго п'е? – *Хазяін: хто прадаець і хто купляець, каб вялося.* – Інакш кажучы, гэта канец здзелкі? – *Да.*" (Верхнядзвінскі р-н)[43]; " – А вось кажуць, што калі цяленка ці карову купляюць, то барыш п'юць. А што гэта такое? – *Барышы – гэта ставяць гарэлку і замачваюць, адны і другія. Гэта барышы, каб вялося. Абязацельна замачыцьˮ* (Верхнядзвінскі р-н)" [44]; "*Барышы пілі той, хто прадаець і той, хто купляець.* – А што ставілі? Самагонку ці куплёную гарэлку? – *У каго была самагонку – самагонку, у каго не было, тады магазіннай этай"* (Шумілінскі р-н)[45]; " – А вось калі барыш пілі, то ставілі гарэлку ці самагонку? – *Самагонку*" (Шумілінскі р-н)[46].

Значнасць і знакавасць самагонаварэння ў будзённым, гаспадарчым і абрадавым жыцці паваеннай беларускай вёскі выявілася ў тым, што **"самагонная" тэма** знайшла сваё адлюстраванне ў жартоўным блоку **песеннага фальклору**. У прыватнасці, песня "Самагоншчыца Маруся" стала папулярнай на ўсёй тэрыторыі Паўночнай Беларусі і фіксуецца як у заходніх, так і ўсходніх раёнах Віцебшчыны. Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што ў песні нелегальны і нават крымінальны промысел не толькі ніякім чынам не асуджаецца, але выступае як пачэсны і нават ганаровы занятак, нягледзячы на тое, што выраб хатняга алкаголю цесна звязаны з не менш цяжкім злачынствам – крадзяжом з калгасных палеткаў: "*Звіньявой я была, зьвіньявой я была / Зьвіньявой я была, буракоў накрала. / Буракоў накрала, самагонкі нагнала. / Самагонка удалася, самагонка удалася, / Самагонка удалася – ўся брыгада напілася. / Як напіўся брыгадзір, як напіўся брыгадзір, / Як напіўся брыгадзір – на работу не хадзіў. / Аграном як заліў вочы, аграном як заліў вочы, / Аграном як заліў вочы, дык паставіў дзень рабочы. / Заацэхнік як напіўся, заацэхнік як напіўся, / Заацэхнік як напіўся – у кармушку уваліўся. / І з раёну была два, і яшчэ 'дзін галава. / І міліцыя была, і міліцыя была, / і міліцыя была, самагоначку піла. / Сталі сход сабіраць, сталі сход сабіраць, / сталі сход сабіраць – каму прэмію даваць. / Зьвіньявой трэба даць, зьвіньявой трэба даць, / Зьвіньявой трэба даць – самагонку ўмее гнаць. / І з цех пор я завуся, і з цех пор я завуся, / І з цех пор я завуся – самагоншчыца Маруся*"[47]. Не менш важкім ёсць сацыяльны кантэкст самагонаварэння, агучаны ў песні, – актыўнымі спажыўцамі нелегальнага алкаголю выступае не толькі калгасная "эліта" (брыгадзір, заацэхнік, аграном), але і прадстаўнікі органаў правапарадку (міліцыя).

Лёс канфіскаванага самагону, а таксама нязводнасць самагонаварэння ў вёсцы паказаныя ў песні "На шашы нагрянула бяда", дзе забраны "первачок" спажывае міліцыя, вясковае вяселле ўсё адно не абыходзіцца без самагону, а фінальны радок падкрэслівае яго запатрабаванасць у вясковым соцыуме: "*На шашы нагрянула бяда / Выслалі міліцыю туда / Ўсе шашы перекапалі / Самагон яныіскалі /Быў перапалох, восьгэта да! / Восем самагоншчыкаў нашлі / В астальные хаты не пашлі / Самагон злівалі ў флягі / Абарачывалі брагу /Акты пракуроры панясьлі. / Жаласна просіўся Паўлючок / Мальчыкі, атдайце хоць глячок / Но глячок яму не далі / Толькі дружна хахаталі / Відна, па душы быў первачок. / Дым ліш показаўся з-пад калёс / Самагоншчык брагу ў лес павез / Апарат сабраліў кучы,/ запалілі ўсе анучы,/самагонку снова сталі гнаць / Закацілі свадзьбу на тры дні / Прыгласілі туда і мяне /Первых дня я воздержалась /А на трэцій налізалась / На корчках я домоў паўзла / Здеся я отлічілась не одна / Памагала ўся мая радня. / Усе ляжалі пад заборам / Іспалнялі песню хорам: /Самагонка каждаму нужна!*"[48]

У жартоўнай песні "Ой ты Марусенька, раскажы-ка харашэнька" самагон выступае як важны гастранамічны маркёр у ідэнтыфікацыйнай мадэлі "свае – чужыя" і вызначаецца як "свой", народны, беларускі ў супрацьвагу іншым алкагольным напоям, суаднесенымі з чужынцамі як у сацыяльным (афіцэры), так і этнічным плане (рускія): *"Ой ты, Марусенька, раскажы-ка харашэнька, / Адкуль у цябе былі госці без меня? (2р.) / Капітан был із Кубані, / Лейценант был із Рязані, /А салдацік рядавой – з Беларусіі радной, (2р.) / Ух ты, мая Марусенька, / раскажы-ка харашэнька, А што ж у цябе пілі госці без мяне? (2р.) / Капітан піл гарэлку, / Лейценант піл лікёры, / А салдацік рядавой – самагоначку са мной. (2р.)"*[49].

**Заключэнне.** Самагон адыгрываў важную ролю ў сістэме жыццязабеспячэння беларускай вескі другой паловы 1940-х – 1960-х гг. Ва ўмовах пасляваеннай карткавай сістэмы забеспячэння і таварнага дэфіцыту, адсутнасці грашовых сродкаў у калгаснікаў у разглядаемы перыяд самагон стаў хадавой валютай падчас нелегальных тавараабменных аперацый і рэальнай крыніцай для заробку грошай, неабходных для самазабеспячэння і для выплаты падаткаў. Практычна за ўсе паслугі гаспадарчага плану (узворванне прысядзібнага участка, дапамога ў будаўніцтве, дастаўка дроваў, арэнда цяглай сілы) ва ўмовах дэфіцыту грашовых сродкаў сяляне разлічваліся саматужна выраблены алкагольным напоем. У адсутнасці грашовых

[43] ЗА 2018 г. ад Трапук Зінаіды Васільевны, 1932 г.н. у в. Азернікі Верхнядзвінскага р-на.
[44] ЗА у 2018 г. ад Быкавай Яніны Барысаўны,1932 г.н. у в. Зябкі Верхнядзвінскага р-на.
[45] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2018 г. ад Коцікавай Надежды Ісакааўны, 1932 г.н., у в. Сіроціна Шумілінскага раёну.
[46] Зап. Корсак А.І.,Сумко А.В. у 2018 г. ад Барсысевіч Розы Людвігаўны, 1928 г.н., у в. Нікіціха Шумілінскага раёну.
[47] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А. у 2009 г. ад калектыву жанчын, у в. Тумілавічы Докшыцкага р-на.
[48] ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. Лобачам У. А. і Аўсейчыкам У.Я. ад Суханавай Кацярына Іванаўна, 1932 г.н., у в. Сіроціна Шумілінскі р-н.
[49] ФА ПДУ: Зап. Лобачам У. А. у 2007 г. ад Волкавай Таццяны Сідараўны, 1919 г.н., у. в. Паршына Горацкага р-на Магілёўскай вобл., зап. у Суражы Віцебскага р-на.

сродкаў самагонка ўваходзіла ў “прадуктовы набор”, які ў выглядзе хабара дазваляў вырашаць разнастайныя жыццёвыя праблемы на карысць вяскоўца. Палявыя экспедыцыйныя матэрыялы сведчаць, што мяжа паміж спажывецкім, спажывецка-таварным і таварным тыпамі самагонаварэння была дастаткова ўмоўная, бо большасць самагоншчыкаў выраблялі сурагаты і для асабістага спажывання (нават брага шла на корм для хатняй жывёлы), і для дадатковага заробку. Суадносіны спажывецкага і таварнага кампанентаў вызначаліся наяўнасцю рынкаў збыту, даступнасцю алкагольных напояў прамысловай вытворчасці і актыўнасцю мясцовых уладаў у сферы процідзеяння самагонаварэнню.

Самагон выступаў як рэгулятар сацыяльных паводзін і як маркер адносін з уладай. Нелегальны характар вырабу самагону ў пэўнай ступені інтэграваў вясковы калектыў, які быў зацікаўлены ў вырабе забароненага прадукту. Разам з тым такая сітуацыя была характэрна для адносна невялікіх весак, аддаленых ад буйных населеных пунктаў ці бальшакоў, дзе склад насельніцва з большага не змяняўся. Аднак з 1960-х гг. назіралася ўстойлівая тэндэнцыя скарачэння так званых неперспектыўных сельскіх паселішчаў, у выніку людзі траплялі ў новае асяроддзе, дзе сацыяльныя сувязі былі не такімі моцнымі, і звычайнай з’явай былі выпадкі, калі суседзі маглі заявіць уладам на самагоншчыка.

З аналізу экспедыцыйных матэрыялаў вынікае, што ў першыя паваенныя дзясяцігоддзі без самагону не абыходзілася ніводнае свята. Самагон абаязкова прысутнічаў у каляндарных і сямейных абрадах і замяшчаў маладаступную крамную гарэлку, семіятычны статус якой у міфапаэтычнай карціне свету славян, асабліва ў рытуалах пераходнага тыпу, быў вельмі высокім. Саматужна выраблены напой як абавязковы атрыбут абрадавага застолля (радзіны, вяселле, пахаванне – памінкі) атрымліваў адносную легітымнасць нават з боку мясцовых уладаў і міліцыі. Знакавасць самагонаварэння ў будзённым, гаспадарчым і абрадавым жыцці паваеннай беларускай вёскі выявілася і ў тым, што “самагонная” тэма знайшла сваё адлюстраванне ў жартоўным блоку песеннага фальклору, надзвычай папулярным у асяродку калгаснікаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Верашчака, К. Сакатала бочачка: праўдзівая гісторыя нашых напояў / Кухмістр Верашчака. – Менск : А. М. Янушкевіч, 2017. – 208 с.
2. Костров, А.И. Расследование самогоноварения / А.И. Костров. – Минск : Университетское, 1988. – 48 с.
3. Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка (далее – ЗГА в г. Полоцке). – Ф. 964. Воп. 2. Спр. 49.
4. Купрэйчэнка. Да суровай адказнасці за выраб самагону // Чырвны сцяг. – 1948. – 22 ліп. – С. 2.
5. Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. Касцюк. – Мінск : ВП “Экаперспектыва”, 2000. – 308 с.
6. Дело о полном уничтожении самогона [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.kommersant.ru/doc/2082632.
7. ЗГА в г. Полоцке. – Ф. 964. Воп. 2. Спр. 77.
8. ЗГА в г. Полоцке. – Ф. 964. Воп. 2. Спр. 71.
9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т.5. Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. / А.М. Боганева [і інш]; ідэя і агул.рэд. Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш.шк., 2011. – Кн. 2. – 911 с.
10. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – 368 с.
11. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск : БелЭн, 2000. – 432 с.
12. Толстой, Н.И. Водка / Н.И. Толстой // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под. ред. Н.И. Толстого. – М. : Междунар. отношения, 1995. – Т. 1. – С. 392–393.
13. Бохан, Л.В. Традыцыі абрадава-святочнага харчавання насельнікаў Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці: па матэрыялах палявога даследавання / Бохан Л.В. // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 25–26 красавіка 2013 г. : у 5 ч. / уклад. Ю.В. Пацюпа. – Мінск, 2013. — Ч. 4: Праблемы этналогіі, антрапалогіі, фальклярыстыкі і славістыкі. — С. 155—159.
14. ЗГА в г. Полоцке. – Ф. 964. Воп. 2. Спр. 62.

*Паступіў 24.04.20108*

## ECONOMIC AND SOCIAL-CULTURAL ASPECT PRODUCTION OF HOOCH IN THE RURAL LANDSCAPE OF NORTHERN BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE 1940S-1960S

***A. SUMKO***

*Production of Hooch the village society was a complex socio – economic phenomenon, which in addition to its utilitarian pragmatics had several important additional projections-socio-cultural ritual and communication. Production of Hooch, as a form of illegal economic activity, can be considered as a special manifestation of the "shadow" economic activity of Belarusian peasants in the difficult conditions of the collective farm system of the second half of the 40s-60s of the twentieth century.*

***Keywords**: hooch, production of hooch, life support system, village, Illegal trade, barter transactions, North of Belarus.*